# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І КУЛЬТУРА

## ТКАЦТВА НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

**Александровіч І.А.,**
студэнтка 1 курса лячэбнага факультэта

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Народнае мастацтва – значная састаўная частка нацыянальнай культуры Беларусі, яе найкаштоўны здабытак і спрыяльнае асяроддзе для развіцця сучаснай мастацкай творчасці. Захаванне і развіццё народнага мастацтва разглядаецца сёння як важная духоўная задача, рашэнне якой мае непасрэднае дачыненне да нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі.

Народным тканінам Гродзеншчыны характэрна глыбокая сувязь з шматгадовым вопытам ручнога узорнага ткацтва. Як прыклад можна ўзяць тэхналогію вырабу мясцовых ручнікоў. Яны досыць разнастайныя: перабіранкі з малюнкамі ("ў пеўнікі", "у кветкі", "у вінаград"); выбарныя ("закладанкі", "у матушкі"); четырохнітавыя ("дымкі", "дрызгуны"), васьмінітавыя ("елачкай"). Аднак пры ўсёй гэтай разнастайнасці іх вызначае дэкаратыўная стрыманасць.

На аснове пераборнага ткацтва ткачыхі Гродзеншчыны ствараюць тканіны закладным або выбарчым спосабам, якія называюць "закладанкі", "у матушкі", "выкладанкі" ці "чашулькамі", "матушкамі". У некаторых мясцовасцях аналагічныя тканіны называюцца "квяцістыя". Аснова альбо ўток падбіраюцца, як правіла, аднаго колеру - белага ці чорнага, рэдка сіняга, чырвонага, карычневага. Ўзор на гэткіх тканінах аднабаковы, дакладней з аднабаковым насцілам узорнага ўтка. Дэкор дзівіць шматкаляровасцю, што надае вырабу своеасаблівы жыццесцвярджальны і святочны характар. Ўспрымаецца такі дыван кветкавым лугам, дзіўнай сімфоніяй колеру. Кожнае выраб, створаны такім спосабам, – гэта сапраўдны мастацкі твор. Сярод сучасных народных мастацкіх тканін Гродзеншчыны зрэдку сустракаюцца вырабы, створаныя лаянкавым спосабам ткацтва. Гэтае ткацтва было распаўсюджана ў 1930-х гадах ХХ стагоддзя.

Двухасноўнае прышчэпнае ткацтва стала своеасаблівай візітнай карткай народнай мастацкай творчасці Гродзеншчыны. Яркім прадстаўніком майстрыхі-ткачыхі, якая працавала ў гэтай тэхніцы, была Ядвіга Райская.

Традыцыі ткацтва берагуць ткачыхі вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна. Шмат у чым дзякуючы стваральніку этнаграфічнага музея А.Белакозу, які вырашыў папоўніць калекцыю творамі землякоў і запрасіў у музей Ядвігу райскі, якая падзялілася сакрэтамі ткацтва. Ткуць ў Гудзевічах жанчыны,

Репозиторий ГрГМУ

а за імі маладое пакаленне пераймае традыцыі ткацтва. Супрацоўнікі Гудзевіцкага музея У.І. Белакоз, У.М. Кібік, М.В. Левусік ўткалі 8 подвойных дываноў, каля дзясятка пасцілак і абрусаў, 30 фартухоў, больш за 10 ручнікоў.

Школьны этнаграфічны музей у вёсцы Квасоўка Гродзенскага раёна размешчаны ў невялікім памяшканні, у якім стаяць кросны. Там школьніцы ў вольны час вучацца ткаць абрусы, ручнікі, посцілкі. Вылучаюцца вырабы квасовскіх вучаніц традыцыйнымі тэхнічнымі прыёмамі і акуратнымі ўзорамі.

Паглядзець на асаблівыя і незвычайныя віды народных тканін можна на розных фестывалях і выставах. Напрыклад фестываль ручніка "мелодыя рушніка" у аграгарадку Адэльск. Па традыцыі свята адкрывае маляўнічае тэатралізаванае шэсце – карагод дзяўчат у нацыянальных касцюмах з дваццаціметровым «рушніком малой Радзімы», караваямі і яркімі стужкамі, якія сімвалізуюць жыццёвы цыкл. Яшчэ адным каштоўным падарункам, падрыхтаваным аддзелам этнаграфіі і фальклору і рамёстваў, з’яўляецца незвычайныя карты раёна: «Азбука беларускага арнамента» і 3-D карта раёна, дзе будуць размяшчацца эмблемы асноўных брэндавых мерапрыемстваў, асноўныя славутасці і архітэктурныя помнікі - тое багацце, якое ў кожнага з нас ёсць на малой радзіме.

Таксама ў Гродне праводзіцца свята традыцыйных рамёстваў, дзе наведвальнікам пакажуць, як ткаць палатно па старажытных тэхналогіях, навучаць вязаць і валяць рэчы з воўны. Вырабы ручной працы, выкананыя ў традыцыйных і сучасных тэхніках, прададуць на выставе-кірмашы.

Час ад часу ў Гродне праводзіцца шэраг майстар-класаў, таксама прысвечаных ткацтву, куды можа прыйсці любы жадаючы.

У цяперашні час праводзіцца работа праекта «Умацаванне самабытнасці сельскіх раёнаў шляхам развіцця традыцыйных рамёстваў і турызму" ў рамках Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія-Літва-Беларусь. Зараз гэты праект актыўна развіваецца ў працы па наладжванні ткацкіх станкоў і працэсу стварэння палотнаў, плануецца правядзенне семінараў па навучанні ткацтву.

Традыцыйна Гарадзеншчына, як і ўся Беларусь, з'яўляецца той тэрыторыяй, дзе ажыццяўляюцца кантакты паміж заходнееўрапейскімі і ўсходнеславянскімі народамі. Менавіта таму майстры гродзенскага рэгіёну пераймалі і выкарыстоўвалі кампазіцыі і тэхнічныя прыёмы працы з тканінамі сваіх суседзей, асабліва з Літвы, Польшчы. Убіраючы ў сябе культуру суседніх народаў, ткацтва Гродзеншчыны тым не менеей захоўвае сваю непаўторнасць і самабытнасць. Яно займае асаблівае месца ў скарбніцы беларускай нацыянальнай культуры.

**Літаратура:**

1. Качан, Г. К. На счастье, на долю / Г. К. Качан. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2019. – 70 с.

2. Коляго, А. В. Ткачество Гродненского региона: традиции и современность / А. В. Коляго // ТехноОбраз – 2013. Творческое развитие и саморазвитие личности в условиях межкультурного образования : материалы IX междунар. науч.-практ. конф. (Гродно, 19–20 марта 2013 г.) : в 2 ч. – Ч. 2. – Гродно : ГрГУ, 2013. – С. 161–165.

3. Лозка, А. Беларускі фальклор / А. Лозка. – Мінск : Зміцер Колас, 2017. – 157 с.



Репозиторий ГрГМУ